*З нагоды*

# Па абодва бакі фронту...

**У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстаўка «Беларусь у Вялікай вайне 1914—1918 гг.», прымеркаваная да 100-годдзя завяршэння Першай сусветнай вайны.**

У экспазіцыі прадстаўлены ўнікальныя экспанаты, якія распавядаюць пра жыццё з абодвух бакоў лініі фронту, рэдкія кнігі, газеты, часопісы, паштоўкі, ліставанне салдат, арыгінальныя пісьмовыя прылады, друкарская тэхніка, асабістыя рэчы і прадметы культу ваеннага часу, паведаміў намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша.

Большасць еўрапейскіх краін у нядзелю адзначаць 100-годдзе завяршэння Першай сусветнай вайны — адной з самых жахлівых падзей у сусветнай гісторыі.

Беларусь апынулася на самай лініі фронту, і для нашых продкаў гэтыя трагічныя падзеі сталі невыносным выпрабаваннем. У той жа час вайна прывяла да краху вялікія імперыі, стварыла новыя магчымасці для фарміравання сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

Тэматычныя раздзелы экспазіцыі, прысвечаныя баявым дзеянням на пачатку вайны, жыццю на фронце, у эвакуацыі і пад акупацыяй, рэвалюцыйным падзеям, падпісанню Брэсцкага мірнага пагаднення, адлюстроўваюць трагічныя і ґераічныя старонкі вайны на тэрыторыі Беларусі.

**Бажэна СТРОК**